НАША ПАМЯЦЬ

# Пакінуў след свой на зямлі

**«Чалавечае жыццё не бясконцае, але працягвае яго памяць. І захоўваць яе пра продкаў – гэта наш святы абавязак», – упэўнена дырэктар Малагарадзячыцкай школы Галіна Бубіч. І кіруецца такім перакананнем як у педагагічнай дзейнасці, так і ў сваім жыцці.**

Галіна Мікалаеўна карпатліва збірае і зберагае звесткі пра родзічаў, якія пакінулі добры след на зямлі. У іх ліку Цімафей Пятровіч Новік, родны брат яе свекрыві. Жыццёвы шлях яго, ураджэнца вёскі Дварэц, быў няпростым, напоўненым выпрабаваннямі. Як большасць тагачасных вясковых дзяцей, скончыў толькі пачатковую школу. І вымушаны быў выконваць сялянскую працу. А яна, як вядома, і ад дарослага патрабуе максімальнай самааддачы, а ад хлапчука тым больш. Але, нягледзячы на стомленасць, ён не пераставаў цікавіцца разнастайнымі праявамі жыцця, рос дапытлівым і свядомым.

У 1938 годзе Цімафея Новіка ад калгаса «Дружба», дзе ён працаваў на той час, накіравалі на курсы трактарыстаў пры Загальскай МТС. А пасля вучобы яму хутка прыйшла позва. Малады чалавек абяцаў годна служыць Радзіме. Тады ён яшчэ не ведаў, што баявы шлях будзе доўгім.

У маі 1940-га наш зямляк стаў курсантам палкавой школы, праз паўгода яму было прысвоена званне старшага сяржанта. Неўзабаве атрыманыя навыкі давялося прымяняць на практыцы – пачалася вайна. Змагаўся з ворагам у складзе войскаў Крымскага, Сталінградскага і іншых франтоў. У баях за горад Сталінград асабліва праявіў сябе: 15 верасня 1942 г. у раёне трактарнага завода пад бесперапыннымі налётамі варожай авіяцыі аднавіў падбіты трактар і пераправіў яго на супрацьлеглы бераг Волгі. А ў студзені 1943-га, нягледзячы на моцныя маразы, здолеў адрамантаваць два трактары, з дапамогай якіх дастаўляліся пушкі на агнявыя пазіцыі. За што загадам ад 07.05.1943 г. Цімафей Новік узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі», крыху пазней – «За абарону Сталінграда»...



Цімафей Пятровіч НОВІК прайшоў нялёгкі ваенны шлях.




Як у час ліхалецця, так і пасля наш зямляк вызначаўся самаадданасцю.

**Пасля дэмабілізацыі Цімафей Пятровіч вярнуўся дамоў і да пенсіі шчыраваў у сельскай гаспадарцы – трактарыстам, брыгадзірам трактарнай брыгады і інш. Шчыраваў сумленна. І прафесійнае старанне не засталося незаўважаным: у 1970-м вясковец адзначаны медалём «За доблесную працу». Склалася і асабістае жыццё. Цімафей Новік разам з жонкай Нінай выхавалі дзевяць дзяцей. А тыя нарадзілі сваіх сыночкаў і дачушак... І прадаўжальнікі роду захоўваюць памяць пра слаўнага продка.**

# Яго наказ – берагчы мір

**Памятаю, якраз прыйшла ў першы клас, калі на ўрачыстай лінейцы калектыў Вялікагарадзяціцкай базавай школы праводзіў на заслужаны адпачынак дырэктара Мікалая Фёдаравіча Свінкоўскага. Тады ў сілу ўзросту я, канешне, не разумела, чаму столькі ўвагі ўдзелена гэтаму сталаму чалавеку з пасівелымі скронямі і задуменным позіркам. І толькі пазней мне стала ясна: ён гэтага заслужыў сваёй працавітасцю, шчырымі адносінамі да жыцця і людзей, адданасцю Айчыне.**

Мікалай Фёдаравіч прайшоў вялікі і слаўны шлях. Нарадзіўся ён у 1923 годзе ў вёсцы Трайчаны. Там зрабіў свае першыя крокі, як усе дзеці таго часу, спазнаў цяжар сялянскай працы, а ўжо юнаком зведаў выпрабаванне ваенным ліхалеццем.

Страшная вестка пра вайну заспела яго ў Мінску. І Мікалай без прамаруджвання накіраваўся дамоў.

**«Сталіцу з першых дзён моцна бамбілі. Горад у многіх месцах гарэў, пачалася паніка. А налёты нямецкіх самалётаў ішлі адзін за адным. Таму даводзілася прабірацца пад варожымі кулямі. Дзе пешшу, дзе на падводзе – праз некалькі дзён нарэшце дабраўся», – прыгадваў пасля Мікалай Свінкоўскі.**

З маленства бацькі прывілі яму любоў да роднай зямлі і радзімы. Таму, патрыёт да глыбіні душы, ён не мог раўнадушна сачыць за тым, як вораг з нахабнасцю імкнецца ўсталёўваць свае парадкі і чыніць здзекі над нашымі мірнымі людзьмі. І ў лістападзе 1942-га далучыўся да лясных мсціўцаў. Са зброяй у руках малады барацьбіт разам з воінамі партызанскага атрада імя Даватара (да 1943-га – А.І. Патрына) удзельнічаў у аперацыях супраць карнікаў.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў наш зямляк быў прызваны ў дзеючую армію. Залічаны ў адзін са стралковых палкоў, што ўваходзіў у склад 1-га Беларускага фронту. З 18 ліпеня па 2 жніўня ўсе сілы яго былі кінуты на ажыццяўленне Люблінска-Брэсцкай аперацыі, у ходзе якой вызвалілі Брэст, Сядлец, Люблін, фарсіравалі Віслу, на левым беразе яе захапілі Магнушаўскі і Пулаўскі плацдармы. Потым удзельнічалі ў Варшаўска-Познанскай, Вісла-Одэрскай. Падчас аднаго з баёў Свінкоўскі атрымаў раненне і трапіў у шпіталь у Познані. Але са строю выйшаў ненадоўга. Акрыяўшы, ізноў далучыўся да барацьбы з ворагам. І дакрочыў да Берліна.



Пінжак Мікалая СВІНКОЎСКАГА аздабляла шмат узнагарод, у тым ліку ордэны Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені.

Пасля доўгачаканай Перамогі Мікалай Фёдаравіч вярнуўся на Любаншчыну і звязаў сваё жыццё з педагогікай: выкладаў матэматыку, быў дырактарам Камунараўскай школы, а затым Вялікагарадзяціцкай.

І на пенсіі доўгі час заставаўся актыўным чалавекам. Узначальваў мясцовую ветэранскую арганізацыю, сустракаўся са школьнікамі, расказваў падрастаючым землякам пра гераічнае мінулае роднага края і наказваў берагчы мір, які быў заваяваны вельмі высокай цаной. На жаль, М.Ф. Свінкоўскага ўжо няма, але яго запавет жыве сярод удзячных нашчадкаў.

**Наталля ВІЛЕНТА.**